


…Усялякае Слова, Богам натхнёнае, – карысна!
Яно вучыць, выкрывае, выпраўляе і карае!

*Францыск Скарына*
*З прадмовы да «Псалтыра»*



Уладзімір
Несцяровіч

# НЕ ГРОМ НЯБЕСНЫ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Н56

**Несцяровіч, У. П.**
Н56 Не гром нябесны / Уладзімір Несцяровіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 156 с. : іл.
ISBN 978-985-581-525-0.

Літаратурна-мастацкі зборнік «Не гром нябесны» Уладзіміра Несцяровіча разлічаны на чытачоў рознага ўзросту. Ілюстраваная малюнкамі кніга ў аднолькавай меры зацікавіць аматараў прозы і паэзіі. Персанажы, створаныя аўтарам пры дапамозе вобразнага мастацкага слова, паўстаюць на старонках выдання нібы жывыя, яны настолькі ўражальныя, што не пакінуць у спакоі самага раўнадушнага. А слова – не гром нябесны, які адно грымне над галавой…

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-525-0**

© Несцяровіч У. П., 2022
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2022

# Замест прадмовы

*Нехта з крытыкаў заўважыў, што кніга – люстэрка душы аўтара. Ці не з'яўляецца пацвярджэннем таго літаратурны зборнік «Не гром нябесны», які ты, шаноўны чытач, са сваім нястрымным інтарэсам зараз гартаеш? Аўтабіяграфічны нарыс «Пад сваёю зоркай» багатай стылістычнай афарбоўкай тэксту і шматлікімі аўтарскімі прыёмамі стварэння ўражлівых малюнкаў асяроддзя, у якім фарміравалася асоба чалавека, належным чынам нагадвае закончаны літаратурны твор. Тут паўстае жывы вобраз не толькі галоўнага персанажа, але таксама яго акружэння, людзей, якія ў многім уплываюць на станенне юнака на пачатку жыццёвага шляху. «Знаходзячыся ў асяроддзі тагачасных мужыкоў – рознага профілю трактарыстаў-машыністаў, падсобных рабочых торфанарыхтоўчага ўчастка, – я вывучаў жыццё, як яно ёсць. Гэта было куды цікавей, чым проста з некім з іх выпіць бутэльку віна», – так аўтар апісвае сваю школу жыцця і зусім не шкадуе, што пачынаў яе ў вытворчай сферы. Падобнага кшталту загартоўку лічыць першаасновай у працэсе развіцця асобы, кім яна б ні была ў далейшым. Канечне ж, аўтабіяграфічны нарыс, як і іншыя ўключаныя ў зборнік матэрыялы, творчай справаздачай пісьменніка лічыць было б памылкова. Але агульнае ўяўленне аб напрамку палёту думкі аўтара яны ствараюць. Адразу звяртаеш увагу на шматжанравасць прапанаваных чытачу твораў: нарыс, апавяданні, вершы, паэма. Тэматыка іх самая разнастайная. Празаік і паэт Уладзімір Несцяровіч піша не толькі аб тым, што яго хвалюе, але і пра тое, да чаго наогул не здольны застацца раўнадушным. Гэта – усё, чым напоўнена жыццё чалавека.*

*Чытаючы кнігу, пачуццём яе герояў абавязкова разгарышся і сам. Тут кожны твор – размова па сутнасці. Дамагацца эмацыянальнага ўздзеяння на чытача аўтару дазваляюць і вострае ўспрыманне жыццёвых з'яў, і ўменне падаць матэрыял так, каб непрыкметнае і нават, на першы погляд, зусім нецікавае зрабілася яркім, вобразным і захапляючым. Напрыклад, ці заўважаў хто начное нябеснае свяціла – месяц – такім забаўным, як паказвае яго пісьменнік у апавяданні «Салдацкая каша»? Безумоўна, месяц «з далікатнай лакейскай паслужлівасцю пачаў паліваць перада мной сцяжыну такім незвычайным святлом, што і не скажаш, чаго ў ім больш – золата ці срэбра». А прыведзеная ў апавяданні лёгкая інтрыга з паляўні-*

*чай стрэльбай толькі дапамагае здагадацца аб прадугледжаным моманце набліжэння падзей шматгадовай даўніны. Твор напісаны нібы па абавязку ўдзячнай памяці. Іншая справа – створаны для аматараў вострага сюжэту «Мутны кактэйль». Нягледзячы на тое, што гэта дэтэктыў, плён выдумкі аўтара, сюжэт, пабудаваны на рэалістычнай аснове, падзеі, адлюстраваныя ярка і праўдзіва, успрымаюцца нібы рэальныя.*

*На сённяшні час паэтычны жанр быццам менш запатрабаваны. Уладзімір Несцяровіч беспамылкова адводзіць яму ў кнізе галоўнае месца. Унікаючы ў змест вершаў, адразу адчуваеш, што аўтар не грэбуе рыфмай, хаця і не ганяецца за ёю ва ўрон напісанаму. Глыбокаму сэнсу адпавядае кожны радок ці нават слова. Куплеты Несцяровіча – гэта поле для разважання. Пры такім раскладзе думак, напрыклад, верш «Сястрычка» далёка не аб тым, што шпрыц у руках медыцынскай сястры ніколі не бяздзейнічае. Верш цалкам для любога з нас ёсць жыццёвы эліксір.*

*Уключаныя ў зборнік вершы нясуць самыя розныя па гучанні матывы. Некаторыя з іх змяшчаюць ваенна-патрыятычную тэматыку. Гэта датычыцца і паэмы. Твор «Агнявы рубеж» займае ў зборніку асаблівае месца. Паэма аб вайне – вечнай, невычэрпнай тэмы для творцаў. Паэт па ўзросце належыць да пасляваеннага пакалення людзей. Хоць ён не мог быць відавочцам ваенных падзей, але смела бярэцца за вырашэнне тэмы вайны. Несумненна мае такое права. Зусім не байка, што перад тым, як брацца за пяро, аўтар пераварушыў аб'ёмісты пласт матэрыялаў, назапашаных ва ўласнай памяці. Па словах паэта, у першую чаргу гэта аповеды відавочцаў і ўдзельнікаў тых жудасных падзей, якія будучаму літаратару надаралася чуць з пары свайго ранняга дзяцінства. Іншым разам імі былі знявечаныя ранамі людзі, а то наогул аднарукія ці бязногія інваліды. Дапамаглі ў рабоце таксама матэрыялы дакументальнай літаратуры і нарэшце ўражанні ад прачытаных мастацкіх твораў на дадзеную тэматыку літаратурных класікаў старэйшага пакалення. Істотным сярод іншых фактараў, што паўплывала на ажыццяўленне задумкі, з'яўляецца багатая творчая фантазія пісьменніка.*

*У зборнік аўтар уключыў таксама рэпрадукцыі сваіх карцін. Мастацкія творы не толькі ілюструюць тэксты, а значна ўзбагачаюць змест прапанаванай на суд чытачу кнігі.*

***Кастусь Цыбульскі,***
*член Саюза пісьменнікаў Беларусі*

# УРАЖАННІ І ПАМЯЦЬ

ПРОЗА



# ПАД САВАЁЮ ЗОРКАЙ

## Аўтабіяграфічны нарыс

Няхай яшчэ мільён гадоў міне,
А з вышыні бязлікага Сусвету
Спытае зорка холадна ў мяне:
«Які дзівак не спіць яшчэ дагэтуль?»

*З уласнага*

Існуе павер’е, быццам пры нараджэнні чалавека на небе запальваецца новая зорка, якая асвятляе шлях у жыцці. Гэта – яго зорка. Так ці не, не ведаю. І ўсё ж калі праўда, то і мая зорка свеціць з вышыні сузор’я Цяльца. Гэта маё другое «Я», да голасу якога іншы раз і прыслухоўваюся. А вось разважанне аб тым, што бясконцая касмічная прастора вакол Зямлі размяшчэннем планет (усіх «хвастатых» і «бясхвостых» нябесных стварэнняў) нейкім чынам здольная ўплываць на стан чалавека, нават на яго здароўе і настрой, што лёс кожнага вызначаецца яшчэ да нараджэння недзе ў незямным лабірынце, прыйшло да мяне ці не тады, як пачаў афармляцца ў самастойную асобу. І вось я на стылым ранішнім перапутку, упершыню ўключыўшы сваю зорку, стаў перад выбарам уласнай жыццёвай сцяжыны. Сістэма, здаецца, спрацавала.

Нашмат пазней, калі ў грамадстве загучаў голас аб маленькай радзіме, чалавек, вяртаючыся да сваіх каранёў нават у самую занядбаную вёсачку-сяміхатку, як кажуць, з лёгкай душой развітваецца з гарадскім камфортам, дзе прайшло амаль усё яго жыццё. А тады, недзе ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, на самым узлёце сваёй крылатай мары застацца дома пасля заканчэння сярэдняй школы – барані Божа. Гэта ці не лічылася нейкай заганай. Падобнае пакідалася даравальным толькі каму-небудзь з

адпетых школьных двоечнікаў. Казалі: «Вось тут, у калгасе, і месца тваё, будзеш коням хвасты закручваць». Калі ж перад маімі вачамі адкрыўся вялікі свет, я, атрымаўшы атэстат сталасці з адзнакамі «добра» і «выдатна», нават не падумаў падавацца да горада, каб штурмаваць дзверы якой-небудзь вышэйшай навучальнай установы ці ўладкоўвацца на працу куды заўгодна, абы толькі зрабіцца гараджанінам, як большасць маіх равеснікаў. Падобная з майго боку выхадка пярэчыла ўсялякай жыццёвай логіцы. Я, застаўшыся дома, пайшоў працаваць на вытворчасць, тым самым як бы паступіў ва ўласную школу жыцця, дзе цалкам залежаў ад абставін, у якія трапіў. Гэта было «Балота» і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Менавіта так папросту называлі вытворчы ўчастак «Іванаўскае». У той час тут пачыналася распрацоўка балота з мэтай нарыхтоўкі сыравіны для торфабрыкетнага завода. Пазней я выкажу свае адносіны да меліярацыі ў вершы на рускай мове:

## БОЛОТО

Когда-то было здесь болото –
Планеты нашей дикий фонд,
На версты многие с востока
Тянулось вдаль за горизонт.

Но человек, вершитель судеб,
Всего на свете властелин,
Легко и просто, без орудий
Здесь местность в корне изменил.

Теперь тут дали полевые
С системой сложной дренажа,
Но только дней тех и поныне
Мне почему-то очень жаль.

Стою у крайних редких сосен
(Мы на охоте с Василем),
А высоко над нами осень
Курлычет тихо журавлем.

Как будто слезы на ресницах,
Блестит у сосен тех смола,
Дружили здесь и зверь, и птица,
Им клюква лакомством была.

Болото ведь не только мох,
Навек подаренный планете,
Хранилось сколько в нем эпох...
И – сколько в нем тысячелетий!

Завод той адкрыўся непадалёк ад райцэнтра Беразіно за два гады да майго заканчэння дзесяцігодкі. Аб тым, што я з галавой кінуўся ў вір жыццёвай плыні, даверыўшыся голасу душы, пакуль не шкадаваў. Прафесія токара, якую набыў на кароткатэрміновых курсах, на той час задавальняла. А чаго яшчэ? Я адчуваў сябе карысным для вытворчасці. Да мяне па ўласнай патрэбе звярталіся людзі, якія там працавалі. З просьбамі вытачыць дэталь заходзілі нават жыхары навакольных вёсак. Ды што дэталь – выробляў прылады ў зборы накшталт неабходнай кожнай гаспадыні машынкі для закрутак шкляных слоікаў пад накрыўкі. Завітаў аднаго разу па сваёй патрэбе і дзед Кандрат з Міластава. Відаць, вельмі зацікавіў тады старога працэс такарнай апрацоўкі металу. Ён доўга і ўважліва глядзеў, як з-пад разца прыгожа змяілася стружка. З чым асацыявалася ў яго свядомасці падобнае відовішча, не вядома. А калі я нарэшце паклаў на дзедаву далонь гарачаватую серабрыстую дэталь, ён вачам не паверыў.

– Жалеза есць жалеза, а чалавек – чалавека, – чамусьці сказаў тады Кандрат.

# ЗАРА-ЗАРАНІЦА

## ПАЭЗІЯ



# КНІГА

Пануе кніга ў краіне
З пары закіданых вякоў,
З часоў асветніка Скарыны
Яна знаходзіць сябрукоў.

Вачастых бачыць навучала,
Вушастым слых давала ўсім,
І кніга скрозь дапамагала
Тым, хто з сабой яе насіў.

З ёй беларус вылазіў з цемры
На Божы свет, на той прастор,
Дзе набываў аблічча, веру,
Узняўшы позірк свой да зор.

# ДАДАТАК

## Фотарэпрадукцыі карцін Уладзіміра Несцяровіча



Аўтапартрэт



Зіма. Павеяла вёскай

# ЗМЕСТ

Замест прадмовы. *Кастусь Цыбульскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**УРАЖАННІ І ПАМЯЦЬ**
*Проза*

ПАД СВАЁЮ ЗОРКАЙ (*аўтабіяграфічны нарыс*) . . . . . . . . 8
МУТНЫ КАКТЭЙЛЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
САЛДАЦКАЯ КАША . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
ЧОРНЫ ЎЗЛЕСАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

**ЗАРА-ЗАРАНІЦА**
*Паэзія*

КНІГА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
МАЯ КНІГА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
СЯСТРЫЧКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
РАНЕЙ І ЦЯПЕР . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
РЫБАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
ПАЭТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
ВЁСАЧКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
ПАДАРАВАНАЯ ПАЛЯНА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
ЗНІШЧАЛЬНІК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
ЛАЗНЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
ЗАПАВЕТНАЯ МЯСЦІНА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
ЗІМОЮ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
З ПАРЫ ДЗЯЦІНСТВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
ДАМОЎ З ПЕРАМОГАЙ (*песня*) . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
ВАЛЬС ВЫПУСКНІКОЎ (*песня*) . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
ШПАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
ЖАЎРУК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
СПЫТАЕ ЗОРКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
ЮБІЛЯРУ ВІКТАРУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
ЦАР-ДУБ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
ЗАРА З ЗАРОЙ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
ВЯСНОВЫМ ДНЁМ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
ШЧУПАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
ГРЫБНАЯ ПАРА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
ПРА РЫБАКА-ФАНАТА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
ЛІТАРАТАРУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80

АПАНЕНТЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
УЗРОСТУ НА ЗАЙЗДРАСЦЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
КІРМАШ НА ПАЛЯНЕ (*казка*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
НЕНАПІСАНЫ ВЕРШ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
АРЭХАВАЯ РАНІЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
ВАЎЧЫЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
НЕ ТАЯ ПРЫКМЕТА (*сатырычным пяром*) . . . . . . . . . . 91
МЫ АДТУЛЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
МЕСЯЦ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
НОЧ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
БЯРОЗАВЫ СОК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
ПРЫСВЯЧЭННЕ ТАМАРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
АБЛОКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
ПЯТРУ ПРЫБЫТКІНУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
ДЗЕД МАРОЗ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
НЕВЯДОМЫ САЛДАТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
ПРЫГАЖУНЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
ЁН АБАРОНЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
ГЕРОЙ У ГРАНІЦЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
ЦЯРПЕЎ ПАПІРУС . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
РАДЗІМА ХЛЕБА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
АД БОГА НЕПТУНА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
НА ПОДЗВІГ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
ВЯСЁЛКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
БУСЕЛ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
БАБІНА ЛЕТА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
КУРГАНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
ЗВЯРЫНЕЦ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
ПАМЯЦЬ СНОЎ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
ЧОРНАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
ДЗЕД І КОТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
НАД БЯРЭЗІНАЙ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
КРЫГАХОД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
НЕ ГРЭХ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
ХАЛОДНЫ ДЗЕНЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122

**АГНЯВЫ РУБЕЖ** (*паэма*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

**ДАДАТАК**
Фотарэпрадукцыі карцін Уладзіміра Несцяровіча . . . . . . . . . . . 143